# Весці

## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 3 (41) 2004**

**Серыя 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
М. С. Вайтовіч
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Л. М. Давыдзенка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
А. М. Люты
І. А. Новік
А. У. Рагуля
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
М. Т. Стэльмашук
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

## З м е с т

### *Гісторыя*

*Дрожжа Л. Ч.* СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ .......... 3

*Конеў Я. Ф.* ГІСТАРЫЧНЫЯ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ФАКТАРЫ ФАРМІРАВАННЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ .......... 7

*Мельнікаў І. В.* АСВЯТЛЕННЕ ПЫТАННЯЎ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТ. (1900—1914 ГГ.) У ПРАЦАХ ПОЛЬСКІХ ГІСТОРЫКАЎ .......... 10

*Крывуць В. І.* ДЗЕЙНАСЦЬ СТУДЭНЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ «БРАЦКАЯ ДАПАМОГА» ВІЛЕНСКАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ С. БАТОРЫЯ Ў 30-я гг. XX ст. .......... 13

*Гаштольд С. В.* НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ КРЭДЫТНА-БАНКАЎСКАЙ ПАЛІТЫКІ САМАЎЛАДДЗЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX — ПАЧАТКУ XX ст. .......... 15

*Космач А. М.* РУХ ПАЎДНЁВЫХ СЛАВЯН ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І ПАДЗЕННЕ АЎСТРА-ВЕНГРЫІ, ПАЗІЦЫЯ ЗША ПА АБАЗНАЧАНАЙ ПРАБЛЕМЕ .......... 18

*Фядковіч Г. І.* КУЛЬТУРА БАЛГАРСКІХ ПЕРАСЯЛЕНЦАЎ У РАСІІ І БЕЛАРУСІ (XIX—XX стст.) .......... 26

*Пілецкі В. А.* АБ ШКОЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫХ І РЭЛІГІЙНА-ІДЭАЛАГІЧНЫХ АБРЫСАХ ВЫХАВАЎЧА-АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ВІЗАНТЫІ НА ЭТАПЕ АДАСАБЛЕННЯ ДЗЯРЖАВЫ .......... 28

*Варывончык І. В.* БАГАТЫЯ І БЕДНЫЯ Ў СУЧАСНАЙ АМЕРЫЦЫ: ПАГЛЫБЛЕННЕ САЦЫЯЛЬНАЙ НЯРОЎНАСЦІ .......... 34

*Смірноў А. У.* РУР І АНГЛА-АМЕРЫКАНСКІЯ СУПЯРЭЧАННІ Ў 1945—1949 гг. .......... 36

### *Філасофія*

*Кікель П. В., Курэц Т. В.* МАТЭМАТЫЗАЦЫЯ АДУКАЦЫІ ЯК ФАКТАР ЯЕ РАЗВІЦЦЯ .......... 39

*Саўчанка Я. А., Парфенчыкава В. А.* ДУХОЎНАСЦЬ І МАРАЛЬНАСЦЬ: АГУЛЬНАЕ І СПЕЦЫФІЧНАЕ .......... 43

### *Паліталогія*

*Ілін М. В.* ПАЛІТЫКА-ТЭХНАЛАГІЧНЫ ІНАВАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС У СІСТЭМЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ .......... 46

*Дабрынец А. В.* ПРАБЛЕМА РАЦЫЯНАЛЬНАЙ СТРАТЭГІІ РАЗВІЦЦЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ .......... 51

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бібліятэка БДПУ імя М. Танка

# САЦЫЯЛОГІЯ

УДК 37.035.4

*Н. В. Паўлава, Г. І. Сцяпанаў*

## САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЯ АДУКАЦЫЯ ЯК ФАКТАР ПАЛІТЫЧНАЙ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

З уступленнем у XXI ст. сусветнае супольніцтва падыходзіць да такога стану, калі далейшы лёс чалавецтва будзе вызначацца ўзроўнем інтэлектуальна-адукацыйнага і інфармацыйна-культурнага развіцця грамадства. На сучасным этапе становішча краін у свеце залежыць не столькі ад ваеннага і эканамічнага патэнцыялу, колькі ад інтэлектуальнага. Менавіта за кошт адукацыі шматлікія з іх атрымоўваюць да 40 % прыросту валавога ўнутранага прадукту (ВУП).

Таму перадавыя краіны прызнаюць і ажыццяўляюць на практыцы ў якасці базавага палажэння дзяржаўнага будаўніцтва прынцып рэальнай прыярытэтнасці навукі, адукацыі і культуры перад усімі іншымі мэтамі і задачамі. Варта адзначыць, што ў ЗША расходы на развіццё адукацыйнай сферы перавышаюць расходы на абарону на 186 млрд гадавога федэральнага бюджэту. У Расіі ж на адукацыю расходуецца толькі 2,6 млрд дол., або 3,8 % сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

Пераход да постіндустрыяльнага інфармацыйнага грамадства патрабуе змянення мэты і зместу адукацыі, павышэння яе ролі як важнейшай крыніцы, асновы і рэсурсу пазітыўных грамадскіх працэсаў. На змену засваення уменняў і навыкаў прыходзяць задачы забеспячэння гатоўнасці да ўспрыняцця новых ведаў і адаптацыі да новых патрабаванняў. Гэта сведчыць аб тым, што праблема адукацыі набывае агульнасусветнае значэнне. Таму не выпадкова XXI ст. аб'яўлена ЮНЕСКА «Веком образования».

Беларусь па-ранейшаму застаецца адной з краін з высокім узроўнем адукаванасці насельніцтва. Па дадзеным паказчыку яна можа канкурыраваць з многімі развітымі дзяржавамі. Разам з тым неабходнасць паступовага руху да адзінай сусветнай адукацыйнай прасторы, а таксама трансфармацыйны характар працэсаў, што адбываюцца ў нашай краіне, эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя рэформы, звязаныя з дэмакратызацыяй грамадства, запатрабавалі новай, адлюстроўваючай сучасныя рэаліі, мадэлі адукацыі. Сутнасць яе складаецца ў падыходзе да чалавека як вышэйшай каштоўнасці, самамэты і галоўнай умовы развіцця грамадства. Менавіта апора на сучасны ўзровень адукацыйнасці грамадства павінна дапамагчы Беларусі вырашыць праблемы, якія стаяць перад ёй у сацыяльна-эканамічнай сферы, у павышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва, забеспячэнні нацыянальнай бяспекі і суверэнітэту.

Пераход да новай мадэлі адукацыі выклікаў неабходнасць рэфармавання яе сацыяльна-гуманітарнай састаўляючай, у тым ліку ў сістэме вышэйшай школы. У цэнтры сацыяльна-гуманітарных ведаў, аснову якіх складаюць навуковыя, аб'ектыўныя і адкрытыя веды аб чалавеку і грамадстве, павінна знаходзіцца праблема творчасці. Творчасць у дадзеным выпадку выступае як асаблівы спосаб чалавечага быцця ў пастаянна мяняючымся свеце, як спосаб самаадукацыі і самавыхавання, самапазнання і самавыражанасці асобы, самаарганізацыі чалавекам свайго лёсу і жыцця ў соцыуме.

Заканчваецца час, калі грамадства арыентавалася толькі на прафесійна падрыхтаваныя кадры. Сёння размова ідзе аб неабходнасці змянення патрабаванняў да асобы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй. Выпускнік ВНУ павінен атрымоўваць не толькі дастатковы аб'ём інфармацыі, неабходны для прафесійнай дзейнасці, але і авалодаць асновамі сацыяльна-гуманітарных ведаў, набыць уменні і навыкі правільна арыентавацца ў імкліва змяняючыхся сацыяльна-палітычных абставінах, аператыўна адаптавацца да яе, актыўна і творча рашаць пастаўленыя жыццёвыя праблемы.

Прыняцце ў ліпені 1999 г. Дзяржаўнага стандарту па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у сістэме вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь дало магчымасць пачаць рэалізацыю забеспячэння ў роўнай ступені прафесійнай, агульнакультурнай і асобаснай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Стандарт прадугледжвае выкладанне ў ВНУ 12 базавых дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла, вызначае аб'ём гадзін на іх вывучэнне. У дадзеным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяржаўным дакуменце прыводзіцца абавязковы мінімум зместу адукацыйных праграм па сацыяльна-гуманітарных навуках, даецца пералік ведаў, уменняў, канкрэтных навыкаў і якасцей, якімі абавязан авалодаць выпускнік за час навучання ў ВНУ. Ён павінен быць падрыхтаваны як спецыяліст, арганізатар і будучы кіраўнік адпаведнага калектыву, адміністрацыйны работнік, грамадскі і палітычны дзеяч. Выпускнік ВНУ абавязан набыць веды і навыкі, неабходныя яму, з аднаго боку, для вырашэння агульнанавуковых, метадалагічных, а праз іх сацыяльных задач, а з другога — атрымаць дастатковую для сучаснага чалавека грамадзянскую падрыхтоўку з тым, каб граматна і кампетэнтна арыентавацца ва ўсіх сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця, рабіць навукова абгрунтаваныя вывады і даваць аргументаваныя ацэнкі адбываючагася для наступнага прыняцця неабходных рашэнняў.

Увядзенне ў дзеянне з 1 верасня 1999 г. Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту ва ўсіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі дазволіла павысіць юрыдычны статус сацыяльна-гуманітарных навук у сістэме вышэйшай школы. Аднак гэта не азначае, што дадзены дакумент вырашыць усе праблемы сацыяльна-гуманітарнай адукацыі. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ў стандарце не ўстаноўлены прамежкавая і канечная формы кантролю па базавых сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах. Таму, як і раней, кожная ВНУ сёння самастойна вырашае гэта пытанне. Акрамя таго, нават унутры самой ВНУ на ўзроўні яе факультэтаў існуе разнабой у формах кантролю ведаў студэнтаў па базавых сацыяльна-гуманітарных навуках. Напрыклад, у БДПУ на адных факультэтах па паліталогіі прадугледжана здача курсавога экзамену, на другіх — заліку і экзамену, на трэціх — курсавога і дзяржаўнага экзамену. У той жа час вучэбным планам матэматычнага факультэта прадугледжваецца форма кантролю толькі ў выглядзе заліку.

Аналагічная сітуацыя мае месца і з аб'ёмам гадзін, што адводзяцца факультэтам на вывучэнне базавых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Тут існуюць значныя разыходжанні ў вучэбных планах факультэтаў.

Існуючае становішча не можа не адбівацца на стане выкладання сацыяльна-гуманітарных навук, на паспяховым засваенні студэнтамі таго аб'ёму сацыяльна-гуманітарных ведаў і уменняў, якімі, адпаведна патрабаванням Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту, павінен авалодаць выпускнік вышэйшай навучальнай установы.

Сацыялагічныя даследаванні апошніх гадоў, праведзеныя ў шэрагу ВНУ Беларусі, сведчаць аб тым, што стан выкладання дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла, іх значэнне і роля ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў неадназначна ацэньваецца студэнцтвам. Напрыклад, рэзультаты сацыялагічнага апытання студэнтаў старшых курсаў БДПУ, праведзенага ў кастрычніку 2001 г., паказалі: 61 % рэспандэнтаў лічыць, што сацыяльна-гуманітарныя навукі дапамагаюць ім разабрацца ў акружаючай рэчаіснасці, у самім сабе і ў іншых людзях; 64,8 % — абагачаюць палітычную, маральную, эстэтычную культуру; 71,9 % — садзейнічаюць развіццю самастойнага мыслення і фарміраванню светапогляду. У той жа час значная частка апытаных (75,6 %) адзначылі, што сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны недастаткова рыхтуюць іх для будучай прафесійнай дзейнасці; 78,6 % — лічаць, што гэтыя дысцыпліны не аблягчаюць вывучэнне прыродазнаўчых і спецыяльных навук, засваенне іх метадалогіі.

Атрыманая ў рэзультаце даследавання інфармацыя, у многім супадаючая з данымі даследчыкаў, праводзіўшых апытанне студэнтаў у шэрагу іншых ВНУ рэспублікі, гаворыць аб неабходнасці ўдасканальвання метадалогіі і методыкі выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. На сучасным этапе ў вышэйшай школе ў большасці выпадкаў пераважае тэндэнцыя на перадачу студэнтам толькі агульных сацыяльна-гуманітарных ведаў, не ўлічваючы профілю ВНУ, прафесійную спецыялізацыю студэнтаў. Асобныя кафедры сацыяльна-гуманітарных навук арыентуюцца на рашэнне гэтай праблемы шляхам уліку спецыфікі факультэта як пры чытанні асноўнага лекцыйнага курса, так і пры чытанні спецкурсаў.

Кафедра паліталогіі і права БДПУ робіць спробу вырашыць гэту праблему шляхам чытання спецкурсаў з улікам спецыфікі факультэта. Напрыклад, на гістарычным факультэце чытаецца спецкурс «Палітычныя дактрыны сучаснасці»; на факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій — «Палітычная псіхалогія»; на факультэце беларускай філалогіі і культуры — «Палітыка і літаратура» і г. д. Праблематыка студэнцкіх вучэбна-навуковых груп, працуючых на шэрагу факультэтаў універсітэта, таксама ўлічваюць іх спецыфіку: на факультэце прыродазнаўства — «Палітыка і экалогія»; на факультэце пачатковай адукацыі — «Правы чалавека і правы дзіцяці» і г. д.

Асноўны недахоп выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін — разрыў паміж тэорыяй і практыкай. Атрымліваючы значны аб'ём тэарэтычных ведаў, многія студэнты не валодаюць дастатковымі навыкамі і ўменнямі іх выкарыстання ў рэальнай жыццёвай сітуацыі, таму

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

важнейшы кірунак працы кафедр сацыяльна-гуманітарных навук — шырокае выкарыстанне ў вучэбным працэсе сучасных педагагічных тэхналогій, актыўных форм і метадаў навучання. Пры гэтым дысцыпліны сацыяльна-гуманітарнага цыкла павінны папаўняцца не толькі новымі парадыгмамі і тэорыямі, адлюстроўваючымі сусветны ўзровень развіцця навукі, але і ўключаць практычны аспект, гэта значыць абгрунтаванне неабходнасці і мэтазгоднасці іх засваення і выкарыстання ў будучай прафесійнай дзейнасці. Гэта дае магчымасць значна актывізаваць пазнавальную дзейнасць студэнтаў, развіваць у іх творчае мысленне, больш эфектыўна рыхтаваць да жыцця ва ўмовах трансфармуючагася грамадства.

Рэфармаванне выкладання дысцыплін сацыяльна-гуманітарных цыкла прадугледжвае наяўнасць асобасных, даверлівых адносін выкладчыкаў са студэнцкай аўдыторыяй, перагляд зместу існуючых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. У многіх з іх асвятляюцца ў асноўным глабальныя рэальнасці свету, прыроды, грамадства, культуры па-за межамі чалавечага бачання, чалавечага вымярэння. Чалавек разглядаецца толькі як прадукт грамадскага асяроддзя, як сродак або фактар грамадскага развіцця. Такое становішча спраў дыктуе неабходнасць змянення зместу і мэтавых арыентацый як вучэбнай літаратуры, так і самога выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у бок пераарыентацыі іх на чалавечае мэтаўзаконенне, на актуалізацыю праблем асобы.

Сур'ёзным стрымліваючым фактарам у выкладанні сацыяльна-гуманітарных навук з'яўляецца недахоп сучаснай навуковай, вучэбнай і метадычнай літаратуры. Фонды большасці бібліятэк ВНУ даволі бедныя. Імкненне выкладчыкаў да свайго прафесійнага росту стрымліваецца жыццёвай неўладкаванасцю, неабходнасцю дадатковага заробку. Многія кафедры сацыяльна-гуманітарных навук сутыкаюцца з сур'ёзнай праблемай змены пакаленняў, старэння кадраў, пераходам маладых, перспектыўных спецыялістаў у іншыя сферы працоўнай дзейнасці, якія забяспечваюць ім больш высокі заробак.

Першачарговая неабходнасць ў сферы вышэйшай сацыяльна-гуманітарнай адукацыі — перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў па адзначаных дысцыплінах. Існуючая ў рэспубліцы сістэма павышэння кваліфікацыі не забяспечвае ў неабходнай ступені вырашэнне тых задач, якія стаяць перад вышэйшай школай. Абазначаныя вышэй і многія іншыя праблемы негатыўна адбіваюцца на ўзроўні выкладання сацыяльна-гуманітарных навук у вышэйшых навучальных установах, падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, здольных да творчай прафесійнай дзейнасці.

*SUMMARY*

*The State of social-humanitarian science teaching in BSPU and other educational establishments is described.*

*УДК 31(410.1)*

*С. П. Раманава*

# КАНЦЭПЦЫЯ ГРАМАДСТВА ЭПОХІ МАДЭРНІЗМУ ЭНТАНІ ГІДЭНСА

У пачатку XXI ст. мы стаім на парозе новай эры, выходзячай за межы мадэрнізму, і сацыяльныя навукі павінны быць падрыхтаваны да ўсведамлення гэтай падзеі. Для вызначэння новага стану грамадства выкарыстоўваецца бясконцае мноства паняццяў, частка з якіх фіксуе з'яўленне новага тыпу сацыяльнай сістэмы (інфармацыйнае грамадства, грамадства спажывання), іншыя проста канстатуюць занапад папярэдняга перыяду (постмадэрнізм, посткапіталізм, постіндустрыяльнае грамадства і г. д.).

Выдадзеныя ў 1990—1991 гг. кнігі англійскага філосафа, сацыёлага і палітолага Энтані Гідэнса (нар. 1938) «Мадэрнізм і самаідэнтычнасць: асоба і грамадства ў канцы сучаснай эпохі» [1] і «Наступствы мадэрнізму» [2] выклікалі шырокі рэзананс у шырокіх колах. Гэта адбылося ў выніку таго, што ён прапанаваў арыгінальную трактоўку праграмнай тэмы макрасацыялогіі — тэмы мадэрнізму, выказаўшы шэраг крытычных заўваг у адрас акадэмічнай сацыялогіі, зрабіўшы спробу супрацьпаставіць ёй уласную сацыялагічную тэорыю.

Гідэнс лічыць класічны сацыялагічны аналіз мадэрнізму нездавальняючым па наступных трох прычынах: 1) аднамернасць у разглядзе працэсу трансфармацыі традыцыйнага грамадства ў сучаснае; 2) неразуменне цеснай і складанай узаемасувязі сацыялагічных ведаў з уласцівай мадэрнізму рэфлексіўнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ